# «На векі вечныя»: аб чым будзе першы беларуска-кітайскі фільм

22.08.2024 18:22 | Аўтар: Лізавета Голад | Культура


Навіны | Папул

09:35 Мінфін прапан маркіроўку ювелірных

09:10 Беларускія тэн прымуць удзел у US C

08:50 Частковая эвак аб'яўлена ў Ісландыі з вывяржэння вулкана

08:32 Датчыкі кантр хуткасці працуюць на участках дарог Мінска

08:00 Лукашэнка пав работнікаў і ветэрана дзяржстатыстыкі з пра

УСЕ НАВІНЫ

Іншыя матэрыялы

У Ляскавічах прайшоў Міжнародны фестывал этнакультурных трады Палесся»

Як праходзіць фестыв Палесся» ў Ляскавічах

«Вяршыня будаўнічай

У рытме «Бібліятэчнаг

Як дзяўчаты з Нацыян школы прыгажосці дз добраўпарадкоўвалі


**Дагавор аб сумеснай вытворчасці фільма 22 жніўня падпісалі Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і кампанія Sichuan Blue Eyes Film and Television Culture Media (КНР).**



Рабочая назва фільма «На векі вечныя». Па сюжэце хлопец з Беларусі і дзяўчына з Кітая воляю выпадку адпраўляюцца ў адно і тое ж падарожжа. Там паступова яны разблытваюць забытую гісторыю гібелі беларускага лётчыка ў 1939 годзе ў Кітаі.

Па словах акцёра і прадзюсара Лэй Ханя, у фільме будуць пераплятацца гістарычная і сучасная часткі.





— Гістарычная частка ахоплівае той перыяд, калі падчас Другой сусветнай вайны савецкія добраахвотнікі дапамагалі кітайцам змагацца з японскімі агрэсарамі. Асноўная мэта гістарычнай часткі — паказаць, што супрацоўніцтва Беларусі і Кітая склалася ўжо даўно. Сёння мы таксама настроены на мірнае ўзаемадзеянне. Асноўная мэта сучаснай часткі сюжэту — паказаць знешнюю прыгажосць Кітая і Беларусі, а таксама ўнутраную духоўную прыгажосць, — растлумачыў ён.

Таксама прадзюсар падзяліўся інфармацыяй, што 30% кінастужкі зоймуць гістарычныя дзеянні, 30% — сучасны час у Беларусі, і яшчэ 40% — сучаснасць у Кітаі.





У сваю чаргу Генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Аляксей заявіў, што гэта пагадненне ўмацуе сяброўства дзвюх дзяржаў, а сам праект дапаможа больш глыбока пазнаёміцца з кітайскай і беларускай культурамі.

— Магчыма, гэта першы крок да такога маштабнага супрацоўніцтва, але ўжо цвёрды і ўпэўнены. Я думаю, у будучым мы разгледзім магчымасць стварэння сумеснай анімацыі, а нашы маладыя аніматары змогуць атрымаць неацэнны вопыт, — адзначыў ён.

Па словах Юрыя Аляксея, графіку для фільма будуць ствараць у Кітаі.





— У іх больш прасунутыя тэхналогіі, якія нам цікавыя. Я б хацеў, каб нашы тэхнікі, аператары і мантажоры паехалі ў Кітай і атрымалі досвед працы з сур'ёзнымі тэхналогіямі. Вялікую стаўку мы робім на маладых хлопцаў з Акадэміі мастацтваў, паколькі для іх гэта будзе жывы прыклад, і яны шмат чаму навучацца, — падзяліўся ён.

Да таго ж Юрый Мар'янавіч дадаў, што ў нашых народаў вельмі шмат агульнага.



— Я быў з візітам у Кітаі. Гэта вельмі блізкія нам па духу людзі. Самае галоўнае, яны высокапрыстойныя, сумленныя, і нам вельмі прыемна з імі працаваць. Вы ведаеце, я вельмі ганаруся тым, што ў нас атрымалася на нашым фестывалі «Лістапад» у мінулым годзе выйсці на такія сяброўскія адносіны, якія перайшлі ўжо ў стадыю рэалізацыі. Гэта вельмі важна і для краіны, і ў цэлым для нашага народа.



Кастынг для ўдзелу ў міжнародным праекце пройдзе 24-26 жніўня ў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Так, на галоўную мужчынскую ролю будуць падбіраць прафесійнага акцёра ва ўзросце 20-30 год. Таксама будуць шукаць і другарадных герояў. Напрыклад, маладую актрысу славянскай знешнасці і хлопчыкаў розных узроставых катэгорый.

**Лізавета ГОЛАД**

**Фота аўтара**